БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
Серпухоуская вул. д. № 12

Рэдакцыя адчынена ад 1 до 2 гадз. пасьля поудня.
Адміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.

Рэдакцыя пакідае за сабой права пераіначваць нерасыланые рукапісы і корэспандэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 к.

Надпіска: з дастаукай да дому у Менску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак:
за верш петыту на 1-й стран. 1 руб.
на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 40. Менск. Панядзелак 13 мая 1918 г. Год I

АБВЕСТКІ.

13 г. м. а 9 гадз. раніцой адбудзецца на Саборным Пляцу парад па прычыні прабывання у Менску ЯГО КАРАЛЕУСКАІ ВЫСОКАСЬЦІ Генэрал-Фельдмаршала Прынца Леопольда Баварскаго.

Білеты на уход дзеля гэтаго будуць раздавацца:

1) Комэндантурою
2) Граданачальствам
3) Ваенным паліцмэйстрам

Разьмяшчэнне публікі павінно быць скончано а 8 с паловаю гадзіне раніцой. На Саборны Пляц публіка будзе дапушчацца толькі з Губэрнаторскаі і Крэшчэнскаі вуліцау.

Распараджанняу паліцыі трэба слухаць безумоуна.

КОМЭНДАНТ
фон-Франкэнбэрг.
ПАЛКОУНІК

Менская Гарадзкая Управа гэтым даводзіць да агульнаго ведама, што у Будаўнічым аддзеле Управы у сераду **15 гэтаго мэя у 1 гадзіну дня** адбудзецца устны торг і сараўнаванне у закрытых копэртах на дзераваныя баракі і іншыя рэчы, знайходзячыеся у **Курасоушчыне.**

Ахвотнікі да таргоу могуць аглядаць рэчы у Курасоўшчыне на мейсцу, а кондыцыі да торгу у Будаўнічым аддзеле Управы што дня ад 10 гадз. зрана да 4 папалудні.

Да торгу павінен быць унесены залог у 5% прапанаванай сумы.

Член Управы
Інжынэр **В. Цывінскі.**
Дзелавод **А. Гнойнскі.**

Менск 13/V.

Калі глянем на тую тытанічную нацыянальную будову, якая узгрунтавалася у нашым краю за апошні год, ні гледзючы на агромадныя перашкоды з усіх бакоу—мы самі уздзівімся. Але асобных віспадзеукау тут быць ні можа дзеля таго, што ужо другое дзесяцілецце куюцца сталевыя асновы гэтай будовы лепшымі сынамі роднаго краю у бузьні нацыянальнаго адраджэння.

Наша нацыянальная праўда,—вымушэная ісьці дагэтуль рознымі акольнымі пуцявінамі, дзякуючы каменням, накіданым проціу нас нашымі ворагамі на кожным кроку простаго шляху;—нарэшці выбілася адкрыта пад сьцягам *нізалежнай дзержаунасьці.*

Іначэй быць ні магло.—Гэтак накіравау сам гістарычны льос. За увесь апошні год да нас плылі людзі розных напрамкау, розных партый тысячамі, дзесяткамі тысячау. І хоць кожны па свойму глядзеу на нашу справу, але далучауся—у віхоры здарэнняу—да агульнаго мора беларускаго руху. Праца кіпела. Арганізовывалося шмат партый, маючых свае органы—газэты. Ад мітынгау—сходак дайшло да вялікіх зьездау, да Усебеларускаго Зьезду. Усе гэта бончылося апофэозам—Беларускай Радай, уласьцію дзержаунай, якая усімі сіламі сваімі стаіць за нізалежнасьць *Беларусі* Гэта—вынік усяго пройдзенаго намі шляху.

Бура улеглася і настау час узяцца за максімальную творчую працу адбудавання краю. Але угледаючыся супакойным і цьвярозым вокам на усе акружаючае, мы пераканаемся у тым, што нам яшчэ патрэбуецца вялікае напружэнне сіл: трэба сярод аграмадных народных массаў нашаго краю тырыць нацыянальнае самоасьведамленне. Так як ва усіх народах Расіі, за год рэвалюцыі, людзі ніжэйшаго стану былі захоплены болей усяго эканамічнымі справамі, то над нацыянальнай палітыкай працавау толькі народны інтэлект—інтэлігэнцыя. А тым болей у нас, беларусау, народныя массы ні маглі мець ніякаго уразумення аб сваей нацыянальнасьці. Блізасьць фронтавога рубежа, наплыу чужога элементу, розныя анты-беларускія агітацыі, сістэматычна расбіваючыя свае сеці па нашаму краю з двух бакоу—Масквы і Варшавы — ні давалі «тутэйшым» людзям азірацца. А нашыя правадыры-інтэлігэнты былі так заняты барацьбою за існаванне самаго імяні Беларусі і прыходзілося ім гэтулькі траціць энэргіі на гэту справу, што вялікай магчымасьці ні было займацца прасьветленнем народу. Хаця шмат зроблена і у гэтым кірунку.

І вось цяпер наступае чарга гэтай віадкладнай работы—злучэнне з народам у шырокім значэнні гэтаго слова.

Дзеля гэтаго трэба ачысьціць грунт, трэба вырваць с карэннямі тыя шкадлівыя расьліны, якія стаяць у попярок нашай дарогі і разьедаюць народны арганізм. Гэта тые паны ягамосьці с Тулы і Крулеусгва, якія асталіся верхаводзіць ва усіх нашых грамадзянскіх і урадных установах па нашых мястэчках і гарадох. Іх аставіу у нашым краю буры прыліу рэвалюцыі і яны цяпер працуюць проціу нас згодна з даунейшымі кампаніямі Салапевічау і Кавалюкоу. Калі край ачысьціцца ад гэтаго чужога, шкадліваго элементу, тады работа пойдзе самым натуральным парадкам.

Тады толькі шырокія массы народу пойдуць злучна з намі і зразумеючы нас, будуць разам з намі бараніць сваю самабытнасьць, як сыны асьвядомленай, нізалежнай дзержаунасьці.

Спатканне.

— Пан Юзэф!

— «Пане Адамэ?!!»

Знаёмы, катораго я зачапіў на вуліцы, здзівіўся так, як бы лічыў мяне ўжо на том сьвеце.

— «Ну, дзе-ж прападаў увесь час—чатыры гады здаецца? — пытаўся ён трасучы мяне за руку—Пастарэў пане Адаме, што?»

— Пастарэў, то пастарэў... на чатыры гады, як ведаіце, але пан як, што парабляеш?

— «Ат, парабляеш! — ўекрыкнуў ён горка перакрывіўшы твар—як-жа!—Мадзеім-во і усе «парабляеш». Служу, т. е. даўней служыў у сваёй палаці, бо цяпер-то ні тое—ні сёе, хату сабе пабудаваў у Людамонці, а болі што-ж?! Паробіш, маючы жонку на шыі і чатырох галчанят,—о-го!»

— Даўней, ведаю пан інача́й глядзеў на гэтыя справы...

— «Гэ-э, «успомніла бабка дзевічвечар»! Даўней! Тут паночку вайна ды рэвалюцыя... каб яе чорт!.. Напаездзілі-б так па ягомосьцю гэтыя Міхайлавы і ні Міхайлавы, то напяволі у сваім кутку сядзеў дый ні рыпаўся-бы!»

— Дык цяпер—німа ужо Міхайлавых, тутака зноў усё беларускае, свае людзі...

— А я хіба ні беларус! Во, нават газэту чытаю: — і пан Юзэф трыумфальна выняў з кішэні «Беларускі Шлях» —толькі ведаеш, пане Адаме ніяк яво ішчэ ні пэўна. Хай яго ліха! Народ надта нісьвядомы. Нават у нашай палаці, дзе апрача двух-трох начальнікаў усе беларусы, такое часам пачуіш!.. Я, бывае, лаюся з імі на службе, лаюся... —Мураўёўшчына, што ты зробіш!»

— А пасьля службы? Мо ў якой арганізацыі працуіце, цяпер усюды патрэбны свае людзі?

— «Ну-у, «мінуліся тые урокі»,—каб мне у арганізацыі лезьці. Хай там хто сабе хоча,—з мяне досыць і свайго дзела!»

— Што-ж пан робіт?

—Мала работы?—Ад 11 да 3 у палаці, ад 3 да 5—паабедаць, там сюд-туд і вечар, —вот і работа!»

— Так, так, пане Юзэфе, праўда, што «мінуліся урокі»... За чатыры гады ні толькі пастарэў, але абстарэчыўся.

— «Кпіш пане Адаме?!»

— Саўсім не...

А. Новадворскі.

Агульныя весткі.

— БЭРЛІН 9 гм. Урадова. Умовы зробленыя на аснове бэрнскай конфэрэнцыі паміж нямецкімі і французскімі дэлегатамі 26 красавіка г. г. аб ваенна палонных і цывільных асобах, запрабованы абаіма урадамі. Умовы прыймаюць сілу ад 15 гм. Іх зьмест у кароткім часе будзе абвешчаны.

— БЭРЛІН. 9 гм. «Voss. Ztg». Саксонскі провінцыяльны сэйм пастанавіў ассыгнаваць поўмільёна марак на учасьце у праэктаваным Таварыстве Нямецкай колонізацыі у надбалтыйскіх провінцыях.

—БЭРЛІН 10 гм «Вольф» Гішпанскі урад паведаміў міністэрство заграгічных спраў, што урад Гватэмалы, згодна с пастанаўленнем сваім ад 30 красавіка г. г. прылучаецца да ваеннаго становішча, пануючаго паміж Злучанымі Штатамі поўначнай Амэрыкі і нямецкай дзержавай.

— ВЕНА. 8 гм. Тэрыторыяльныя уступкі Румыніі на карысьць Вэнгрыі дасягаюць да 5000 кв. клм., на карысьць Аўстрыі, на поўдзень ад Чэрнавіц 600 кв. клм.

Уступка тэррыторыі зроблена ядына для папраўкі стратэгічных граніцаў і для безпасрэдняго злучэння Букавіны з Вэнгрыяй. На адступленай тэррыторыі німа ні аднаго значнейшаго гораду.

— БУКАРЭШТ. 9 гм. «Вольф». Каралеўскім указам абыдзьве палаты Румынскаго парлямэнту распушчаны. Новыя выбары назначаюцца на 1—9 чэрвеня. Збор парлямэнту мае быць 17 чэрвеня.

— МАДРЫД. 10 гм. «Havas». Гішпанская рада міністраў згодзілася на праэкт—тымчасовай дзержаўнай манаполіі на адросткі прамысловасьці патрэбныя для гасударсцьвенай абароны.

— АМСТЭРДАМ. 10 гм. «Reuter». Генэрал Магон глаўны начальнік ваенных сілаў у Ірляндзіі пацьвярджае,

што ў хуткім часе накіне Ірляндзію.

— КОУНА. 10 гм. «К. В.». 4 гм. прэзыдыуму літоўскай краёвай Рады быў ўручаны дакумэнт падпісаны. Я. Ц. М. Цэсарам, на моцы якога Нямецкай дзержавою даецца прызнанне літоўскай нізалежнай дзержаві.

Уручэнне у урочыстай форме было зроблено начальнікам ваеннаго ураду Літвы, каторы у прамове выказаў маладому літоўскаму гасударству шчасьця і удачы.

Зьмест дакумэнту адзаковы с атказам зробленым імпэрскім канцлерам літоўскай дэлегацыі у Бэрліне 23 сакавіка г.г.

РОТТЭРДАМ. 8 гм. Подлуг вестак з Стокгольму фінляндскі габінэт с сваім старшынёю Свінхувудам на чале варнуўся з Вазы у Гельсінгфорс, каторы зноў будзе рэзидэнцыяй фінляндскаго ураду.

ЛЕНДАН. 10 гм. «Havas». Усе румынскія вайсковыя місіі з Англіі, Францыі і поўночнай Амэрыкі подлуг весткі «Morgnig Post» адозваны у Ясся.

Весткі з Расіі.

— Частка матросаў Бальтыцкаго флоту забажала павялічэння пэнсіі на 50%.

— Архангельскім совдепом забаронены ўезд у Архангельск без афіцыяльнаго дазвалення.

— Ад 5 маю у Петраградзе хлебная пайка зменьшана да 1/8 ф.

— 14 г.м. у Петраградзе адбудзецца першае засяданне цывільнаго аддзелу акружнаго суду з народнымі засядацелямі.

— 3 г. м. з Мрамарнаго дварца у Петраградзе выкрадзены пакі з сталовым серабром, шмат каштоўных рэчаў і вялікія харчовыя запасы.

— Подлуг паведамлення прэзыдыуму цэнтр. вык. каміт. быўшы цар Мікалай II разам з жонкаю і аднэй з дачок цяпер знайходзіцца у Екацерынбургу, Пермскай губ., пад надзорам абласнога Уральскаго совдепа.

— У Рыбінску 30 красавіка пачаліся крывавыя ніпарадкі на грунце нідастачы харчовых прадуктаў. Насяленне ніздаволенае выдачай толькі двух фунтаў мукі на 15 дзён, начало хваляваццa і у канцы, вялікія натоўпы сабраліся каля «совету» патрабуючы павялічэння пайкі і выдачы крупчаткі на Вялікдзень. Члены савецкаго прэзыдыума і старшыня былі схоплены натоўпам і моцна пабіты. Выклікaная у часе гэтаго чырвоная гвардзія адмовілася стрэляць у галодных людзей. Атдзельных чырвона-армейцаў і гвардэйцаў «бунтаўнікі» абезброівалі. Як апошняя апора «совдепу», катораму прыгражала вялікая нібэзпечнасьць, былі выкліканы латышскія стральцы, пачаўшыя паліць у людзей. Нескольскі чалавек было равено. «Бунтаўнікі» разбегліся, але парадку ні было нескольскі дзен. Па цэлым дням ішла стрэляніна.

— Аздабленне Масквы на 1 мая чырвонымі плакатамі і эмблемамі ні абышлося без абразы для рэлігійнаго пачуцця жыхароў. Большэвікі ні паважаючы нічога і нікога пазавешвалі чырвонымі тканінамі з сваімі падпісамі сьвятыя для масквічоу абразы у Крамлю. Іверская капліца была задэкорована чырвоным плакатам. Над Мікольскаю брамай, закрываючы абраз св. Мікалая красаваўся плякат з напісам: «да здравствует трэтій інтэрнацыонал». І хаця гэтыя плакаты былі, як кажуць «знішчаны ветрам» і віселі ні надта доўга, верныя ні магли успакоіцца і доўга збіраліся перад сьвятынямі голасна наракаючы на большэвікоў, с прычыны чаго зноў перад Крамлём былі стрэляніна і арэшты.

МАЛЕНЬКІ ФЭЛЬЕТОН.

БАТЛЕЙКА.

Сцэна прэдстауляе від местовай управы у часе вялікіх рэзалюцый—вечарам. Батлейшчык спіць. Але нейкім цудам фігуркі самі выходзюць на сцэну. У салі пуста, але з-за партэрау высоуваюцца зацікауленыя насы і блішчаць вочы.

(Выходзіць на сцэну беларус, чалавек без усякіх хітрыкау. Вакол беларуса тоупяцца яго ворагі, фігуры хцівыя, хітрыя і спрытныя).

Беларус:

Цікавыя рэчы суседзі гаворуць
Адзін за адным гулка уторуць.
Усе аба мне,
Ао маей старане.
За полы хапаюць,
Грахі вылічаюць:
Усе гэткія вады:
Да Расіі—здрада,
Да Польшчы—нікаханне,
У Немцау—зауфанне,
З Украйнаю—брацтво,
З Літвою—сябрацтво,
Да жыдоу—сымпацья,—
Дык мушу сказаць я:
— Адчапіцеся паночкі,
Галубочкі!
Мая орыентацыя:
Гэта нацыя
Беларуская!

Ворагі беларуса (паміж сабою):

„Што нам з ім валаводзіць,
З орыентацыей ні выходзіць,
— Дапячом другім,
Разлічымся з ім.
Думы да земствы
— І усе прэдпрыемствы
Ціж ні у нашых руках?
Хай па свойму пад фірмай свабоды
Гаспадараць тут нашыя роды
А яму—па патыліцы,
Хай толькі узьнімецца».
(Сьмяюцца сабе у кулак).

Беларус. (Сам з сабой):

Нілюблю ніпрауды,
Нілюблю нішчырых.

Ворагі беларуса (хіхікаючы, паміж сабой).

«А мы прауду й шчырасьць,
— Кінулі у вір іх!»

(Злосна хіхікаюць. Беларус углядаецца у іх твары. Сцэна нямая, але надта выразная).

Б.—П.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Сярод народных вучыцелеу пінскага павету, як паведамляюць гласныя губ. зем. сабрання, 28 красавіка адбыуся у м. Століне (адміністратыуны цэнтр павета) агульны зьезд дзеля абсуджэння прафэсіянальных прававых патрэб.

Выбрана сярод вучыцелеу паветовая школьная рада (4 чал.), як вышэйшы орган у павеці па дагляду за асьветай.

Заслухано і прынято для прэд'яулення паветовай зем. управе калектыунае хадатайство зьезду аб назначэнні вучыцелям што месячную пэнсію 300 р., замест цяперашніх 50 руб. (пры Керэнскім плацілі лічучы агулам пэнсію, сутачныя з пяцігадовою прыбаукай 100 р. у месяц).

Апрача таго, зьезд выказау пажаданне аб тым, каб у павеці, хаця і «украінізаваным», справачнай дзержаунай мовай была—расійская.

Цэны у Вялікодную пятніцу, 10 мая, на Троіцкім рынку:

Дровы — 25 р. воз.
Сено — — 13 р. пуд.

болей ніякога падвозу ні было. Цэны на прадукты у Пінскім павеці:

Хлеб — —75 к. фунт.
Яйкі — 2. — к. дзес.
Цукер 2. 80 к. фунт.

Цэны у Ромнах:

Хлеб — —70 к. фунт.
Мясо — 1 р.— »
Цукер 1. 50 к. »

Абсеянне палеу у маентках бліжэйшых паветау амаль усюды кончылося поунасьцю: калі дзе гаспадароу ні было, дык, па загаду нямецкай улады, гэта рабілі селяне. Калі насення дзе было мало, то давалі немцы.

Аналогічнае яуленне с паеевам замечалося і у «украінізаваным» пінскім павеці.

У паветах пінскім, мазырскім і рэчыцкім зямельныя камітэты канчаюць раздел між селянамі пад пасеу памешчыцкай зямлі на самых льготных умовах.

У местовай управе усяго за апошні месяц уволено служачых, дзеля зьмяньшэння штатау у розных аддзелах (глаунае у аддзелах апекавання) 50 чал. з агульнаго ліку 120-ці.

Выплачэна пэнсія усім упрауцам за красавік.

Нарэшці!

У скарбовай палаце гэтымі днямі зьявіуся перад служачымі б. яе загадчык, Комароу (у часе большэвізму уволены па прыгавору хауруса палацкіх служачых); ен заявіу, што хоча «заняць» старое мейсцо, прычым ставіць умовай, каб зараз жа было уволено 10 служачых—аутарау яго адстаукі.

Служачыя аднагалосна пратэставалі.

Комароу зьвярнууся у Градоначальство, дзе яму вытлумачылі, што асоба, уволеная хаця бы пры большэвізме, але па ініцыятыве самых служачых—звароту ні належыць.

Прышлося экс—загадчыку Комарову зноу знікнуць з менскаго горызонту.

У губэрнскае прысуцтвіе прыходзюць з валасных камітэтау пеперы аб выдачы дакумэнтау па зямельна-выкупных плацежах селян.

Гэта належыць да спэцыяльнаго аддзелу--аграрна—выкупнаго і сэрвытутнаго,—скасованаго пры большэвізме разам з іншымі губэрнскімі установамі.

Прысуцтвіе, ні рашучыся самаму пачаць рашэнні падобных звертанняу з валасных камітэтау, передае іх на перагляд нямецкаму градоначальству.

Гэтым прысуцтвіе як бы пакaзывае абавязковую патрэбнасьць адкрыцця як найхутчэй належучаго аддзелу.

У «У. З. С.» шмат з служачых яго па камітэту заходняго фронту, страціушы веру у самую мажлівасьць рэялізацыі калі нібудзь выданых на рукі грошавых абавязковасьцей (аб выплатцы пэнсіі і лiквідацыйных) едуць партыямі у маскоускі цэнтральны земсаюзны камітэт, дзе ім выдаюць авансам 400 руб., а на рэшту—новы квіток.

І то добра, калі лепей быць ні можа.

Выбары у еурэйскую обшчыню, адбыушыяся па 10-ці ізбірацельным спіскам, далі перавагу, як вядома, сіаністскай партыі—2330 голасоу (21 мейсцо).

Сярод іх есьць відныя грамадзянскія дзеячы; д-р Бруцкус, інжэнэр Каплан, таварыш старшыні местоваго харчавога камітэту і дырэктар крэдытнаго Т-ва Хургін. Рэшта 18—с сярэдняго стану, паттрымaныя, глауным чынам, домауласьнікамі і таргоуцамі.

Другі па ліку—есьць партыя «Бунда», атрымаушая на выбарах 1883 голасы (17 мейсцау). Хоць гэты спісак меньшы па ліку, але за тое ярчэй іменамі, як напр.: старшыня думы—Вайнштэйн, думцы—Фрумкін-Віхман, Гэрцік (банкоускі дзеяч), Камінскі (доктар), д-р Тэумін (старшыня мест. харчавога камітэту).

Ад безпартыйнаго спіску № 9 адмечаем грамадзянскаго дзеяча—д-ра Лунца.

Ва усіх упрауленскіх аддзелах Л. Р. ж. д., з'арганізаваныя з акупацыяй краю так. званыя «ліквідацыйна-эксплоатацыйныя камісіі» (15-20 чал.) атрымалі ад нямецкай улады запэуненне, што могуць без рыску за сваю будучую матэрыяльную долю вярнуць у Менск эвакуіраваныя у 1915 г. сямействы. (Гэта належыцца толькі да членау вышэй паманеных камісій).

10 мая паехау у Маскву у Раду Камісарау, дзеля выяснення упрауленскіх спрау, начальнік камэрцыйнай службы Папоу.

Камэрцыйная служба з ліквідацыяй пастаулена у вельмі цяжкое становішчо: на руках—горы капітальных дакумэнтау (дублікаты грузавых накладных, плацежныя абавязковасьці, журнальныя пастановы і інш.), а наладзіць у іх парадак нельга, дзеля спынення пачтовых адносін с купцами адправіцелямі і атрымацелямі а так сама жалезнадарожнымі станцыямі Л. Р.

Вось дзеля усіх гэтых пытанняу выехау Папоу у Раду.

Тры новых пастановау глаунокам. генэрала фон-Фалькенгайма уходзяць у моц с 15 мая—аб ахране ваенных будовау, менняў і другіх рэчэй ваеннаго значэння, аб хаванні агневай броні і прыпасау узрыучатых рэчэй—і аб утрыманні грамадзянскаго супакою і безапаскі нямецкаго войску у акупаваных мейсцах.

За усе нарушэнні гэтых пастановау—цяжкая кара па законах ваеннаго суда і часу.

Весткі с краю.

З Вільні.

--Stadthauptmann'ам аназвешчаны новыя найвышэйшыя цэны: кварта нізьбіранаго малака—50 пф., кварта зьбіраняго—20 пф.; расійскі фунт солі—29 пф., 100 таблетак сахарыны 65 пф., 500 таблетак—2 мрк. 75 пф.; трубка крышт. сахарыны—1 мрк. 60 пф., трубка крыст. сахар. 100 грм.—30 мрк. Скрыначка запалак—10 пф.

— Беларускі Камітэт за красавік мес. выдаў 2,462 дармовых абеды. У тым ліку праз Беларускую Народную Страўню 1,680, бонамі на іншыя страўні 782. На Вялікдзень вучням беларускіх школаў у Вільні і наагул бедным дзецям камітэт раздаў дарма 200 нямецк. фунтаў пшонай мукі, 150 ф. бульбянай.

(«Гоман»)

Ж а р т ы.

Штука сварыцца.

Філасофа спыталі:

— У чым выяўляецца барацьба партыяў?

Ен адказаў:

— У барацьбе сябелюбства, тэмпэрамэнтаў ды кіданьні словам «правакатар».

Яму адказалі:

— Філасоф, вы забыліся аб барацьбе праграм!

Ен адказаў з усьмешкай:

— Аб гэтым забываюцца самі сварыўшыеся, на што-ж мне аб гэтым памятаць?!

Як ен стау рэспубліканцам.

(Споведзь Са—ча).

Бачу: з манархіей каюк. Бачу: Мікалаю II ні уратаваць сябе. Думаю: «ратуйся—хто можа». Дай адратую сябе хоць у беларусаў, падпішуся на беларускую газэту, зраблюся сэпаратыстым: запішуся у беларусы! Бачу: Рэспубліка мусі быць. Крычу: Хай жыве Беларуская Рэспубліка! Думаю: Дасць Бог, можа мяне беларусы прыймуць за міністра.

Вялікае цуда.

З магілай лейтэнанта Шмідта зрабілося вялікае цуда: труна з яго целам перанесена была з манархічнай зямлі у рэспубліканскую.

Рэдактар А. Прушынскі.
Выдавецтво Т-во «Заранка».
Друкарня А. Грынблята